УДК 821.161.3-133

Навуч. Г.С. Каржаневіч
Навук. кір. Н.П. Саланевіч, настаўнік беларуская мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі (ДУА "Сярэдняя школа №16 г.Пінска")

# ПАЭТЫЧНЫ КВЕТНІК ЛЕАНІДА ДРАНЬКО-МАЙСЮКА

Мэта майго даследавання: выяўленне спецыфічных асаблівасцей стварэння разнастайных вобразаў кветак ў творчасці Леаніда Дранько-Майсюка.

Дасягненне пастаўленай мэты прадугледжвае вырашэнне наступных задач:

1. Вызначыць частотнасць ўжывання вобраза кветкі ў творах паэтаў, якія ўключаны ў школьную праграму па вучэбным прадмеце "Беларускай літаратуры".
2. Высветліць ролю кветак ў лёсе і творчасці Леаніда Дранько-Майсюка.
3. Устанавіць індывідуальнасць паэта праз вобраз кветкі.

Аб'ект даследавання: вершы, эсэ сучаснага беларускага паэта Леаніда Дранько-Майсюка.

Прадмет даследавання: вобраз кветкі ў творчасці Леаніда Дранько-Майсюка.

Спосабы даследавання: тэарэтычныя, колькасныя метады; прыёмы аналізу, сінтэзу.

"Мае землякі жылі з таго, што вясной прадавалі насенне кветак і сваім дзецям, калі яны прасілі купіць цацкі, казалі: "Глядзіце на кветкі – гэта самыя лепшыя цацкі ў свеце!..". Змалку кветкі ўвайшлі ў маё жыццё і пазней сталі маёй літаратурнай тэмай," – гаворыць паэт.

Перачытаўшы зборнік "Гаспода", я ўпэўнілася ў словах паэта. У творах зборніка я налічыла 33 разнавіднасці кветак.

Паэзія і краса роднага Давыд-Гарадка, матчынага агарода адкрываюцца ў творах Дранько-Майсюка, што нарадзіліся падчас вандровак у Германію, Бельгію, Францыю і Грэцыю. У паэзіі Л.Дранько-Майсюка гучыць узнёслы гімн матчынаму агароду.

У эсэ "Стомленасць Парыжам" цесна перапляліся парыжскі дух з Давыд-Гарадком, матчын кветнік і творы французскіх мастакоў.

Чытаючы "Пасляслоўе" ствараецца ўражанне, што ты – у музеі, ідзеш ад карціны да карціны.

Петунія – "сіні ластаўчын ускрык"; коўрыкі – "як навагодняя ёлка, якую з зімы прынеслі ў лета"; астры – "сіне-бялёсы агонь"; настуркі – "гадзіннікі, якія мелі дакладны пах"; сальвія – "паненка без

жаніха”; вяргіня – “летняя калядная зорка”, валошка – “адзіная краска, на якую глядзіць анёл перад тым, як ляцець па нябожчыка”; лілея – любімая кветка Апалінэра.

Вобраз кветкі па-свойму раскрываецца ў песеннай лірыцы Леаніда Дранько-Майсюка. На вершы паэта напісана больш як тры дзясяткі песень: “Ружа белая”, ”Верасень хрызантэм”, ”Прынц і ружа” і іншыя. Сярод іх песня на верш “У Вашым голасе квітнеюць астры…”, які стаў амаль класічным.

На аснове праведзенага даследавання можна зрабіць наступныя высновы:

1. У творчасці Леаніда Дранько-Майсюка матчын агарод – гэта цэлы свет, поўны хараства і таямніц, незвычайнасці формаў і колераў.

2. Кветкі не проста аздоба ў паэтычным вершы, эсэ паэта. Гэта – паэзія яго жыцця, яго душы.

3. Леанід Дранько-Майсюк – неардынарны і арыгінальны чалавек, паэт хараства, прыхільнік лірыкі тонкай пачуццёвасці, уражлівай эмоцыі і вобразнасці.

Навізна работы вызначаецца спробай разгледзець вобразы кветак на прыкладзе сучаснага паэта Леаніда Дранько-Майсюка як неардынарнага і арыгінальнага чалавека, прыхільніка лірыкі тонкай пачуццёвасці, уражлівай эмоцыі і вобразнасці, які далучае непаўторную мелодыю фарбаў роднай зямлі, матчынай мовы да мелодыі еўрапейскай і сусветнай культуры.

УДК 821.161.3.633

Навуч. К.В. Кірык-Маставая
Навук. кіраўнік Л.І. Неўгень, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА “Сярэдняя школа № 1 г. Скідзеля”)

## ЖАНРАВА-СТЫЛЁВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ПАЭЗІІ ЛЮДМІЛЫ КЕБІЧ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ЗБОРНІКА ТРЫЯЛЕТЫ. ТЭРЦЫНЫ. РАНДЭЛІ.”)

Беларуская сучасная паэзія – суквецце талентаў, якое вызначаецца самабытнасцю і непаўтарнасцю кожнага, бо кожны, паводле афарыстычнага выразу Аркадзя Куляшова, капае “рэчышча ўласнай ракі”, якую скіроўвае ў акіян сусветнай культуры.

Сучасная беларуская паэзія – шматаблічная, шматфарбная, разнастайная па жанрах і стылёвай дынаміцы, пазначаная арыгінальнымі творчымі набыткамі. Цікавы і багаты свет паэзіі, у якім